**Кіраёнак, С.** Пакутніцкая смерць / С. Кіраёнак // Памяць : Гарадоцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Н. А. Бурунова [і інш.] ; уклад. С. І. Садоўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : Беларусь, 2004. – С. 357–358.

## ПАКУТНІЦКАЯ СМЕРЦЬ

Вясной 1942 г. Іван Антузаў стаў байцом 2-й Беларускай партызанскай брыгады. У пачатку красавіка 1943 г. група партызан колькасцю 9 чалавек, у якой быў і Іван Антузаў, пайшла на разведку ў в. Карнілы Вярэцкага сельсавета. Цэлы дзень з узлеску вялося назіранне за вёскай. Гадзін каля 12 ночы ўвайшлі ў Карнілы. Партызаны спакойна праз былы калгасны двор выйшлі на вуліцу ў цэнтр пасёлка.

Усюды было ціха і раптам раздаліся кулямётныя і аўтаматныя чэргі. Успыхнулі ракеты. Група трапіла ў засаду. Партызаны заляглі і адстрэльваліся. Затым пачалі адыходзіць да лесу. Ісці па агародах і ворыву было цяжка, наўздагон несліся варожыя кулі. Адстрэльваючыся з карабіна, апошнім адыходзіў Іван Антузаў. Ён трапіў у паласу ворыва, ногі гразлі ў зямлі. І ў гэты момант яму ў нагу вышэй калена ўдарыла нямецкая разрыўная куля. Перасільваючы боль, працягваў страляць з месца. Партызаны аддаляліся. Заўважыўшы, што таварыш іх адстаў, паспрабавалі прабрацца да яго, але не змаглі.

Іван вёў агонь адзін. Мучыў боль у назе, сілы пакідалі партызана. Скончыліся патроны, засталіся толькі дзве гранаты. Калі фашысты падышлі да яго, каб узяць жывым, кінуў адну з іх. Ворагі падаліся назад. А другую гранату Іван, выцягнуўшы чаку, заціснуў у руцэ. Аднак страціў прытомнасць. Захопнікі прыцягнулі партызана ў в. Карнілы ў хату калгасніцы Ганны Бугровай. Ахвяру прывялі ў прытомнасць халоднай вадой, пачаўся допыт. Фашысты хацелі ведаць, дзе знаходзяцца партызаны, але Іван маўчаў. Тады па загаду афіцэра эсэсавец агаліў грудзі партызану і пачаў цесаком выразаць скуру. Утварылася рана ў выглядзе сярпа і молата. Іван маўчаў. Фашыст выразаў яму на ілбе зорку. Затым яго перавярнулі на жывот, і ўжо другі нямецкі салдат выразаў зорку на спіне. І зноў партызан не сказаў нічога. Тады нямецкі афіцэр прысыпаў раны яго соллю. У адказ на гэты здзек пачуўся працяглы стогн. Паклаўшы палоннага на спіну, каты выкалалі яму вочы. Іван Антузаў страціў прытомнасць і больш ужо не прыйшоў ў сябе. Смерць яго была жудаснай, аднак ён не выдаў таварышаў.

Мёртвае цела партызана фашысты выкінулі на двор. Аб гэтых страшэнных здзеках расказала Ганна Бугрова, якую немцы разам з дзецьмі загналі ў хату, і яна аказалася сведкай катавання.

**С. Кіраёнак**